ІНСТЫТУТ ПАЛІТЫЧНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ

ПАЛІТЫЧНАЯ СФЕРА

Palitsfera Working Papers No. 10/2026

ПАМЯЦЬ ПРА ПАЎСТАННЕ

Наратывы 1863 года ў беларускіх грамадскіх дыскусіях, 2010–2024

Palitsfera Working Papers No. 10/2026

Памяць пра паўстанне

Наратывы 1863 года ў беларускіх грамадскіх дыскусіях, 2010–2024

Андрэй Казакевіч

Інстытут палітычных даследаванняў
«Палітычная сфера»

Маштабы і дынаміка інфармацыйнага патоку

Праз пошук інфармацыі на сайтах трох дзяржаўных (“СБ. Беларусь сегодня”, “Звязда”, БелТА) і трох недзяржаўных (“Наша ніва”, “Радыё Свабода”, “Люстэрка/Зеркало”) за перыяд з 2010-га па 2024 год было сабрана 1967 публікацый, у якіх згадвалася паўстанне ці яго асноўныя героі. Атрыманыя даныя сведчаць пра выразна большую актыўнасць незалежнага сектара (80,4% агульнага аб’ёму публікацый) у параўнанні з дзяржаўнымі СМІ (19,6% адпаведна).

Варта ўлічваць, на момант збору даных (першая палова 2025 года) поўныя архівы з 2010 года мелі не ўсе выданні. Недзяржаўнае выданне «Зеркало” ўзнікла толькі ў 2021 годзе. Пры гэтым не было магчымасці ўключыць у аналіз публікацыі самага папулярнага ў Беларусі да 2021 года парталу Tut.by, што непазбежна робіць сітуацыю няпоўнай. Сярод дзяржаўных выданняў відавочна няпоўны архіў мела газета “Звязда”, што таксама магло паўплываць на заніжэнне вынікаў для дзяржаўных СМІ ў першай палове 2010-х. Частата публікацый у 2010–2024 гады дэманструе як агульныя тэндэнцыі, так і істотныя разыходжанні паміж дзяржаўным і незалежным сектарамі.

Тым не менш, нават калі выключыць “Звязду” і “Зеркало” з аналізу, можна назіраць з пачатку 2010-х значны рост цікавасці да тэмы паўстання. Сярэдняя гадавая колькасць публікацый пяці СМІ, які маюць цэласныя архівы, за ўвесь перыяд даследавання складаюць 115 публікацый. Для 2020-2024 гг. сярэдняя частата складае 145 публікацый. Кожнае СМІ, узятае асобна, таксама дэманстравала рост колькасці публікацый у апошнія гады.

Атрыманыя даныя дазваляюць абгрунтавана канстатаваць, што прысутнасці тэмы паўстання ўзрасла прыблізна ў 1,8 раза, калі параўноўваць перыяды 2010–2019 і 2020–2024 гадоў. Пазітыўная дынаміка зафіксаваная ва ўсіх тыпах медыя (дзяржаўных і незалежных). У выбарцы выданняў з рэгулярнымі архівамі за ўвесь прамежак часу каэфіцыент росту складае 1,4–1,7.

Нягледзячы на агульную пазітыўную дынаміку ў абодвух сектарах, публікацыйная дынаміка дзяржаўных і незалежных СМІ мела сутнасныя адрозненні. Для незалежнага сектара асноўнымі імпульсамі выступалі юбілейныя даты (2013 і 2023 гады) і ключавая камемаратыўная падзея — перапахаванне парэшткаў кіраўнікоў паўстання і К. Каліноўскага ў Вільні (2019 год), тады як у інтэрвалы паміж юбілеямі інтэнсіўнасць матэрыялаў істотна зніжалася. Дадатковы ўсплёск інтэнсіўнасці зафіксаваны з 2020–2021 гадах, што абумоўлена актывізацыяй паўстанцкага сімвалічнага рэпертуару ў грамадска-палітычным дыскурсе і пашырэннем практык ушанавання памяці па-за межамі Беларусі.

Дынаміка публікацый пра паўстанне 1863–1864 гадоў



Іл. 1. Дынаміка публікацый пра паўстанне 1863–1864 гадоў, 2010–2024

У дзяржаўных медыя ўсплёск публікацый прыпадае на 2013 год, калі ўлады рэагавалі на грамадскія святкаванні і частка прарасійскага істэблішменту пачалі новы этап крытычнага пераасэнсавання паўстання з падкрэсліваннем яго “польскага” характару. Таксама павысілася цікавасць да асобы Мураўёва, услед за ростам цікавасці да яго рускіх нацыяналістаў. Калі гаварыць пра колькасць публікацый, то юбілей 2023-га быў праігнараваны, хаця ў гэты год з’явілася некалькі ідэалагічна важных крытычных артыкулаў, якія задалі рамкі новаму этапу дзяржаўнай палітыкі. Таксама спад публікацыі назіраўся ў 2019 годзе, калі адбылося перапахаванне кіраўнікоў паўстання 1863 года ў Вільні. Але пры гэтым можна назіраць сінхранізацыю цікавасці ў 2020 і 2021 гадах, пераважна ў форме палітычнай палемікі і як рэакцыі на дыскусіі ў недзяржаўных СМІ.

Тэматыка публікацый

Сфармаваны масіў матэрыялаў атрымаўся вельмі разнародным па аб’ёме, змесце і жанравай прыналежнасці. Можна вылучыць сем асноўных жанрава-тэматычных катэгорый: біяграфічныя нарысы, юбілейныя матэрыялы (прысвячэнні гадавінам ключавых падзей ці асобам), тэксты аб лакальнай гісторыі, анонсы выданняў пра паўстанне, спецыялізаваныя агляды паўстання ды інфармацыйныя паведамленні пра сучасныя мерапрыемствы ўшанавання памяці.

У агульнай структуры даследаванага масіву дамінуе фармат ускосных адсылак да паўстання ў межах іншых тэкстаў (каля 40%). Другую пазіцыю займаюць публікацыі пра сучасныя формы камемарацыі — грамадскія акцыі, шэсці, мітынгі ды прэзентацыі (21,3%). Прыкметную долю атрымалі юбілейныя матэрыялы (13,9%) і публікацыі з лакальнай гісторыі (13,4%). Агляды гістарычных падзей і эпізодаў паўстання складаюць 5,7%. Іншыя жанрава-тэматычныя катэгорыі заставаліся нязначнымі і іх доля не перавышала 1–2,5%.

Тэматыка публікацый



Іл. 2. Тэматыка публікацый. Ад агульнай колькасці за 2010–2024 гады

Разам з тым прасочваецца выразная дыспрапорцыя ў жанравай структуры дзяржаўнага і незалежнага сектараў. Хоць для абедзвюх груп аналізаваных СМІ дамінантным фарматам застаюцца лаканічныя адсылкі да паўстання ў межах матэрыялаў на розныя тэмы, у незалежных выданнях іх частка складае каля 33%, у той час як у дзяржаўных сягае 67,2%. Другое месца ў дзяржаўнай прэсе займаюць публікацыі з лакальнай гісторыі (22,7%), тады як на тэматыку сучаснай камемарацыі прыпадае толькі 3,9%. Іншыя фарматы вагаюцца ў межах 0,5–3%.

Другую пазіцыю ў незалежным сектары займае тэматыка сучаснай камемарацыі — 25,5% (звыш 400 матэрыялаў). Наступныя месцы размеркаваліся паміж юбілейнымі публікацыямі (16,6%), краязнаўчымі нарысамі (11,1%) ды спецыялізаванымі гістарычнымі аглядамі (6,8%). Частка біяграфічных тэкстаў і анонсаў новай літаратуры застаецца невялікай (1–2%).

Атрыманыя даныя сведчаць пра жанравую разнастайнасць незалежнага сектара пры выразнай аднастайнасці дзяржаўнага. Дзяржаўныя медыя фактычна ігнаравалі юбілейныя даты і практыкі камемарацыі, абмяжоўваючыся ўскоснымі згадкамі паўстання ў пераліку гістарычных падзей або ў палітычна акцэнтаваных матэрыялах. Вымушана фіксуючы кантэкст, яны хутчэй пазбягалі ўмацавання традыцыі памяці. Адзіным значным каналам трансляцыі засталася інтэграцыя падзей 1863 года ў краязнаўства — гісторыя населеных пунктаў, маёнткаў, будынкаў.

Для незалежнага сектара, па-першае, уласцівая павышаная ўвага да публічных практык камемарацыі, якія часта прымалі форму палітычнай і апазіцыйнай актыўнасці. Па-другое, назіраецца сістэмнае канструяванне і захаванне памяці пра падзеі 1863 года праз шырокі

набор: юбілейныя публікацыі, спецыялізаваныя гістарычныя агляды, артыкулы па лакальнай гісторыі ды іншыя фарматы.

Дамінантныя наратывы і іх вымярэнне

Памяць пра паўстанне 1863 года — гэта ў тым ліку змаганне наратываў, якія адлюстроўваюць беларускае ўнутрыпалітычнае супрацьстаянне, а таксама напрамкі расійскага ўплыву. У межах гэтага даследавання мы вылучылі пяць наратываў, якія цыркулююць у інфармацыйнай і культурнай прасторы. Кожны наратыў атрымаў сваё лічбавае значэнне для далейшага колькаснага аналізу.

Аднясенне тэкстаў да наратываў праводзілася праз аналіз у кожным тэксце сэнсавых акцэнтаў і тэрміналогіі.

Сярэдняе значэнне наратыву па гадах і сектарах

Іл. 3. Сярэдняе значэнне для наратываў па гадах і сектарах, 2010–2024

Першы наратыў: беларускае нацыянальнае паўстанне. Сюды трапляюць усе тэксты, якія вызначалі паўстанне як частку беларускага нацыянальнага руху. Тэкстам з гэтай групы прысвойвалася значэнне “пяць”.

Другі наратыў: “паўстанне са значным беларускім нацыянальным кампанентам”. У гэтым выпадку можа адзначацца, што паўстанне насіла шырокі рэгіянальны характар, але пры гэтым мела выразны беларускі элемент, нават калі яшчэ і няма падстаў казаць пра развіты беларускі нацыянальны рух. Тэкстам гэтага наратыву прысвойвалася значэнне “чатыры”.

Сэнсава нейтральныя тэксты. У выніку аналізу значная колькасць тэкстаў была аднесена да катэгорыі “нейтральных”. У большасці гэта кароткія згадкі, калі немагчыма рэканструяваць пазіцыю аўтара ці ён наўмысна пазбягае выяўляць такую пазіцыю. У такіх выпадках тэкстам прысвойваліся тры балы.

Чацвёрты наратыў: “польскае паўстанне з мясцовым элементам”. Наратыў, які апісвае паўстанне як “польскае” і “шляхецкае”, падкрэслівае адсутнасць сувязі з беларускім нацыянальным рухам, хаця пры гэтым можа прызнавацца мясцовая этнаграфічная спецыфіка. Напрыклад, адзначаецца ўдзел беларускай дробнай шляхты ці сялян, выкарыстанне беларускай мовы ў агітацыі. Лічбавае значэнне гэтага наратыву — “два”.

Пяты і апошні наратыў: “польскае паўстанне”. Ён апісвае паўстанне выключна як польскае, у адпаведнасці з расійскай гістарыяграфічнай традыцыяй. Лічбавае значэнне наратыву — «адзін».

Выбарная метадалогія дазваляла вызначыць сярэдняе значэнне наратыву для любога масіву тэкстаў. На ілюстрацыі 3 можна бачыць, якім чынам змяняліся гэтыя значэнні для дзяржаўных і недзяржаўных выданняў з 2010-га па 2024 год.

Вынікі паказваюць, што дыстанцыя паміж дзяржаўным і недзяржаўным сектарам зафіксавалася з 2013 года. У недзяржаўным сектары сярэдняе значэнне наратываў выглядае дастаткова стабільным і вагаецца ў дыяпазоне 3,72–4,12 пункта. Як і ў любым інфармацыйным масіве, значная частка тэкстаў не змяшчае характарыстыкі паўстання і адносіцца да катэгорыі “нейтральных”, рэшта вызначае яго ці як беларускае нацыянальнае, ці як паўстанне з беларускім нацыянальным элементам.

Дынаміка ў дзяржаўным сектары была крыху іншай. У 2013 годзе, падчас чарговага юбілею паўстання, можна бачыць выразнае падзенне сярэдняй лічбы да 3,18 — гэта самы нізкі паказчык да палітычнага крызісу 2020 года. У якасці рэакцыі на 150-гадавы юбілей па дзяржаўных СМІ прайшла хваля крытычных публікацый і дыскусій, якія задалі новыя рамкі афіцыйнага поля — дыяпазон 3,18–3,45. Такім чынам, сярэдняе значэнне наратываў заставалася ў “беларускай” зоне, крыху вышэй за ўзровень “нейтральнасці”.

Палітычны крызіс 2020 года цалкам змяніў сітуацыю. Пачынаючы з 2021 года, сярэднія значэнні сталі падаць і дасягнулі мінімуму ў 2023 годзе, калі наблізіліся да значэння “2”, гэта значыць дамінавання наратыву пра польскі характар паўстання. У 2024 годзе назіраўся некаторы адскок у бок нейтральнасці, але наколькі гэта тэндэнцыя ўстойлівая, пакажуць далейшыя назіранні. Тым не менш можна фіксаваць з 2022 года выразны пераход да дамінавання ў афіцыйнай інфармацыйнай прасторы наратываў польскага характару паўстання. Магчыма гэта адбылося ў Беларусі ўпершыню не толькі за перыяд незалежнасці, але і з моманту распаду Расійскай імперыі.

Калі паглядзець на асобныя выданні, то “нацыянальныя” версіі інтэрпрэтацыі паўстання найбольш выразна былі прадстаўлены ў публікацыях “Радыё Свабода” і “Люстэрка” — сярэдняе значэнне 4–4,1. Крыху ніжэй знаходзілася “Наша ніва” (3,8 бала), потым “Звязда” і БелТА (3,2–3,3 бала). З масавых выданняў толькі для “СБ. Беларусь сегодня” сярэдняе значэнне знаходзілася ў “польскай зоне” наратываў — 2.8–2.9. Пры гэтым значэнні недзяржаўных медыя заставаліся дастаткова стабільнымі ўвесь перыяд даследавання. Найбольш залежнай ад кан'юнктуры выявілася “СБ. Беларусь сегодня”, дзе назіраўся рэзкі пераход ад “нацыянальных” да “польскіх” наратываў. Тут у першыню пераход у “польскую” зону адбываецца ў 2017 годзе і канчаткова фіксуецца з 2020 года. Эвалюцыя БелТА і “Звязды” была значна больш павольнай,

хоць і з выразнай тэндэнцыяй “паланізацыі” пасля 2020-га. Пераход у польскую зону БелТА адбываецца ў 2022 годзе, а «Звязды» ў 2023-м.

Сярэдняе значэнне наратыву для асобных медыя



Іл. 4. Сярэдняе значэнне наратыву для асобных медыя. Параўнанне 2010–2020 і 2021–2024

Умацаванне гераічнага пантэону

Паўстанне 1863–1864 гадоў было дэцэнтралізаваным, у арганізацыі яго ўдзельнічала вялікая колькасць людзей, а кіраванне мела калектыўны характар. Тым не менш у беларускай грамадскай традыцыі гэтыя падзеі маюць выразную персаніфікацыю ў асобе Кастуся Каліноўскага, што вельмі адрозніваецца як ад польскіх, так і ад літоўскіх практык памяці.

Сабраны масіў тэкстаў дазволіў прааналізаваць структуру і функцыянаванне (анты)гераічнага пантэону паўстання. У даследаваных публікацыях вылучаліся ключавыя гістарычныя дзеячы, якія знаходзіліся ў цэнтры ўвагі аўтараў. Як правіла, з назвы і зместу матэрыялу лёгка вызначалася цэнтральная постаць ці некалькі звязаных з ёй асоб. Калі ж колькасць згаданых фігур была занадта вялікай і без выразнай іерархічнасці, такія тэксты з выбаркі выключаліся. Адпаведна, першасны аналіз грунтаваўся на фіксацыі галоўнай (або 2-3 асноўных) постацяў, а не на механічным падліку агульнай колькасці згадак кожнай з іх.

Вылучэнне цэнтральнай постаці (або групы ключавых дзеячаў) выявілася магчымым у 62% апрацаваных тэкстаў. Рэшта публікацый або не змяшчала персаналізаваных згадак, або падавала значны масіў імёнаў без выразнага структурнага акцэнту. Прааналізаваны корпус уключае розныя жанравыя фарматы: біяграфічныя артыкулы, інфармацыйныя паведамленні пра мерапрыемствы, краязнаўчыя нарысы, аналітычныя каментары ды меркаванні.

Агулам публікацыі пра паўстанне былі прысвечаны 132 асобам. Самую шырокую персанальную наменклатуру дэманструе «Радыё Свабода» (67 асоб), далей ідзе «Наша ніва» (58) і «Звязда» (38). Менш прадстаўнічымі выявіліся “СБ. Беларусь сегодня” (26), БелТА (17), «Зеркало» (10), а найменш — часопіс «Беларуская думка» (2 асобы).

Амаль 50% постацяў былі паўнавартасна згаданыя толькі аднойчы. Двойчы ў тэкстах фігуравалі 10 дзеячаў, тройчы 16, а ў дыяпазоне ад 4 да 8 разоў — 18. Найвышэйшы ўзровень прысутнасці ў гераічным ці антыгераічным пантэоне (10 і больш згадак) прадэманстравалі толькі 14 асоб. Атрыманыя даныя сведчаць пра істотную дыспрапорцыю ў размеркаванні персаналій паміж дзяржаўным і незалежным сектарамі, а таксама паміж асобнымі СМІ.

Напрыклад, Людвік Нарбут зафіксаваны на высокіх пазіцыях з 25 публікацыямі, аднак пераважная іх частка прыпадае на «Радыё Свабода» і толькі паасобныя матэрыялы — на «Звязду». Падобная лакалізацыя характэрная для Міхала Цюндзявіцкага (згадваўся выключна ў «Нашай ніве» і на «Радыё Свабода») і Адама Фалькоўскага (прысутны толькі ў «Зеркале», «Нашай ніве» і на «Радыё Свабода»).

Для рэканструкцыі супольнага пантэона ў групу паглыбленага аналізу ўвайшлі толькі тыя постаці, якія атрымалі не менш за 10 згадак і былі прадстаўленыя ў большасці медыя з абодвух сектараў (як дзяржаўнага, так і незалежнага). У выніку было вылучана 11 асоб, якія складаюць найвышэйшы пласт даследаванага пантэона.

Безальтэрнатыўным лідарам з'яўляецца Кастусь Каліноўскі, чый вобраз ужо больш за стагоддзе знаходзіцца ў цэнтры грамадскіх дыскусій. Вынікі даследавання дэманструюць ступень дамінавання ў калектыўнай памяці пра падзеі 1863 года: на яго прыпадае 31,3% ад агульнага масіву тэкстаў і звыш 50% усіх згадак пра асоб. Ніводная іншая постаць не мае супастаўных вынікаў і нават блізка не дасягае ўзроўню ў 10%. Каліноўскі быў прысутны на парадку дня ўсіх даследаваных СМІ і меў перавагу ва ўсіх жанрах — ад навін пра імпрэзы да біяграфічных аглядаў і аналітыкі.

Згадкі К. Каліноўскага ў публікацыях



Іл. 5. Доля тэкстаў са згадкай К. Каліноўскага ад агульнай колькасці публікацый пра паўстанне 1863, 2010–2024

Другую пазіцыю, са значным адставаннем, займае антыгерой паўстання Міхаіл Мураўёў (4,3% агульнага медыя патоку і 6,9% персаналізаваных публікацый). Нягледзячы на спробы асобных

аўтараў акцэнтаваць яго постаць, паказальны маштаб застаецца несупастаўным з увагай да К. Каліноўскага. За выключэннем часопіса «Беларуская думка» (дзе дыспрапорцыя абумоўленая малааб'ёмнай выбаркай), постаць генерал-губернатара, які атрымаў мянушку «Вешальнік» як у паўстанцкім, так і ў расійскім левым асяроддзі, прыцягвала ўвагу пераважна незалежных СМІ. У дзяржаўных рэсурсах («Звязда», «СБ. Беларусь сегодня», БелТА) яго прысутнасць на парадку дня заставалася на мінімальным узроўні.

Аналіз персаналій па-за дыхатаміяй «Каліноўскі — Мураўёў» сведчыць пра глыбокі разрыў у рэпрэзентацыі астатніх вайскова-палітычных лідараў паўстання. Рамуальд Траўгут фігураваў у большасці СМІ, аднак з істотна ніжэйшай інтэнсіўнасцю. Прычым у дзяржаўным сектары ягоная прысутнасць (4–7%) была нават вышэйшай за Мураўёва, тады як у незалежных медыя заставалася перыферыйнай (1–3%). Вобраз Зыгмунта Серакоўскага цыркуляваў амаль выключна ў незалежнай прэсе пры поўнай адсутнасці ў дзяржаўнай. Прыкметную колькасць згадак атрымалі і вайсковыя камандзіры Валеры Урублеўскі ды Генрык Дмахоўскі — 15–16 публікацый за ўвесь даследаваны перыяд. Прыблізна гэтак жа часта згадваўся Віктар Каліноўскі.

Астатнія персаналіі прадстаўляюць не кіроўны склад і натхняльнікаў паўстання, а яго шараговых удзельнікаў, якія атрымалі публічнае прызнанне ў іншых сферах. Ключавое месца тут займае Францішак Багушэвіч: па частаце згадак ён саступае толькі Мураўёву і прысутнічае з роўнай інтэнсіўнасцю як у дзяржаўных, так і ў незалежных СМІ. Прыкметныя пазіцыі займаюць Эліза Ажэшка (з перавагай публікацый у дзяржаўных медыя — “СБ. Беларусь сегодня” і «Звяздзе»), Ян Чэрскі і Зыгмунт Мінейка. Для гэтай катэгорыі дзеячаў уласцівая разнародная прысутнасць у медыяпрасторы без выразнай прывязкі да аднаго жанру.

Збалансаванасць персанальнага складу. Як ужо адзначалася вышэй, найбольшую жанрава-персанальную шырыню дэманструе «Радыё Свабода» (67 асоб), але пры абсалютным дамінаванні згадак пра К. Каліноўскага. У сваю чаргу, найвышэйшая структурная збалансаванасць зафіксаваная ў газеце «Звязда»: паказчыкі трох дзеячаў (Э. Ажэшка, Ф. Багушэвіч, Р. Траўгут) у сукупнасці супастаўныя са згадкамі пра Каліноўскага. Аналагічны баланс можна бачыць і ў “СБ. Беларусь сегодня”. Аднак гэтая раўнамернасць абумоўленая перанакіраваннем згадак пра падзеі 1863 года на выключна краязнаўчую тэматыку, ігнараванне сучасных практык камемарацыі, а таксама мэтанакіраванай працай супраць вобразу Каліноўскага пасля юбілею 2013 года.

Як называць паўстанне?

Ключавым элементам палітыкі памяці выступае намінацыйная стратэгія і выбар тэрміналогіі. Пачынаючы з XIX стагоддзя падзеі 1863 года называліся па рознаму: у расійскай гістарыяграфічнай традыцыі дамінуе тэрмін «Польскае паўстанне», у польскай «Студзеньскае паўстанне» (Powstanie styczniowe), тады як у савецкай азначэнне грунтавалася на канцэпцыі яго «(сацыяльна)вызваленчай» або «антыцарскай» прыродзе.

У беларускім кантэксце выкарыстанне той ці іншай назвы вельмі часта звязана з палітычнай пазіцыяй. Існуючыя тэрміны і словазлучэнні можна разбіць на некалькі кластараў. Першы кластар вылучаецца выкарыстаннем расійскай імперскай і сучаснай прарасійскай тэрміналогіі, што практыкуецца рознымі прарасійскімі сіламі, а эпізадычна і беларускімі ўладамі.

Намінацыі ў межах гэтага кластара будуюцца вакол наступных катэгорый у розных спалучэннях: «польскае (шляхецкае) паўстанне», «польскі бунт», «польскі мяцеж» і падобнае. Важным з'яўляецца падкрэсленне выключна польскага характару падзей.

Наступны кластар генетычна звязаны з савецкай гістарыяграфіяй і падкрэслівае тое, што паўстанне было накіравана супраць Расійскай імперыі і самаўладства: "паўстанне супраць самаўладдзя", "рэвалюцыйны рух 1863 года", "паўстанне супраць царызму", "антыцарскае паўстанне". Найбольш часта выкарыстоўваецца спалучэнне "паўстанне супраць царызму".

Катэгорыя «Студзеньскае паўстанне», перанятае з польскай гістарыяграфіі, эпізадычна сустракаецца ў недзяржаўных публікацыях як дадатковае азначэнне або пры спробах пашырыць рэгіянальны кантэкст і параўнанне. У дзяржаўных жа медыя гэты тэрмін служыць часам для таго, каб зрабіць дадатковы акцэнт на яго польскім характары.

Кластар "нацыянальнае" і "нацыянальна-вызваленчае". У гэтым выпадку падкрэсліваецца імкненне да нацыянальнага вызвалення. Хоць катэгорыя «вызваленчае» можа адсылаць да савецкай традыцыі і пазначаць сацыяльнае вызваленне, у сучасных публікацыях яна ўсё больш звязваецца менавіта з нацыятворчасцю.

Кластар «антырасійскае / антыімперскае паўстанне». Гэтая дэфініцыйная стратэгія дэканцэнтруе нацыянальную афарбоўку падзей 1863 года і іх прывязанасць да асобнага нацыянальна-вызваленчага руху, пераносячы аналітычны акцэнт на супрацьстаянне імперскаму цэнтру.

Каліноўскацэнтрычны кластар. Найбольш выразную спецыфіку дэманструе персаналізацыя падзей праз постаць кіраўніка — у формулах «паўстанне (пад кіраўніцтвам / на чале з) Кастуся Каліноўскага», дзе выкарыстоўваюцца варыятыўныя азначэнні «вызваленчае», «нацыянальнае» і інш.

Нейтральныя назвы. Асобную групу складаюць нейтральныя назвы, якія не змяшчаюць дадатковых характарыстык: «паўстанне 1863 года», «падзеі 1863 года» або проста «1863 год».

У некаторых матэрыялах згадкі пра паўстанне 1863 года адсутнічаюць, што ўласціва, у прыватнасці, для інфармацыйных нататак пра акцыі ўшанавання памяці К. Каліноўскага або звязаныя з ім камемаратыўныя ініцыятывы.

У выніку ўжыванне розных тэрміналагічных кластараў было размеркавана наступным чынам. У 22% публікацый паўстанне згадавалася, і гэта ў большай ступені тычылася незалежных медыя. Аднак абсалютна дамінавала нейтральнае азначэнне. Перавага нейтральнай тэрміналогіі можна звязаць як са зручнасцю (асабліва ў кароткіх нататках і публікацыях, якія не патрабуюць істотнага разгортвання кантэксту), так і з імкненнем да палітычнай нейтральнасці і пазбягання каштоўнасных ацэнак ва ўмовах вострых дыскусій і палітычнай напружанасці. Такое пазіцыянаванне шырока прадстаўлена ў дзяржаўных і незалежных СМІ прыблізна ў аднолькавай долі — 56–58%.

Што да аксіялагічна нагружаных намінацый, то тут першае месца належыць кластару «паўстанне Кастуся Каліноўскага». У дзяржаўных медыя яго доля была нават крыху вышэйшая (каля 10%) у параўнанні з незалежнымі (блізка 6%). Найбольш актыўна гэта азначэнне ў

афіцыйных медыя ўжываўся ў 2018–2020 гадах, пасля чаго пачалося яго скарачэнне, а поўнае знікненне адбылося пасля выступу Ігара Сергеенкі ў 2023 годзе. У публікацыях 2024 года гэты тэрмін ужо цалкам адсутнічае.

Намінатыўная катэгорыя «нацыянальна-вызваленчае паўстанне» складае 3,8% ад агульнай выбаркі і дэманструе выразную дыскурсіўную асіметрыю: пры адзінкавых згадках у дзяржаўных, асноўны аб'ём ужывання прыпадае на незалежныя медыя. Аналагічны дыстрыбутыўны профіль характарны для словазлучэння «вызваленчае паўстанне» (2%), які сустракаецца амаль выключна ў незалежных СМІ. Рэпертуарныя маркеры «антырасійскае паўстанне» і «паўстанне супраць Расійскай імперыі» зафіксаваныя эксклюзіўна ў незалежным медыясегменце (~2%).

«Польскае паўстанне». Уласна «польскім» паўстанне называецца пераважна ў дзяржаўных СМІ. У незалежных медыя такое азначэнне сустракаецца або ў палемічных матэрыялах (дзе даецца магчымасць выказацца прыхільнікам розных версій), або бярэцца ў двукоссе. У дзяржаўных выданнях частка гэтага азначэння дасягае 9%, што прыблізна супастаўна з ужываннем назва «паўстанне Кастуся Каліноўскага». Аднак нельга сцвярджаць, што гэтая намінацыя замацавалася як дамінантная, у колькасці згадак яна пакуль саступае беларускай "нацыянальнай" тэрміналогіі. Першы ўсплёск ужывання "польскага паўстання" ў дзяржаўных медыя стаў рэакцыяй на юбілей 2013 года, але з 2017 года гэтая тэндэнцыя набыла ўстойлівасць і дасягнула піку ў 2023 годзе. Тэрмін ужо можна лічыць замацаваным у дзяржаўнай інфармацыйнай прасторы.

Такім чынам, дамінантнай стратэгіяй і ў дзяржаўных, і ў незалежных СМІ з'яўляецца ужыванне нейтральнай назвы «паўстанне 1863 года» ў розных варыянтах. Гэта тлумачыцца як меркаваннямі эканоміі месца, так і імкненнем пазбегнуць крытыкі і дыскусій наконт «правільнага» найменння. У дзяржаўных медыя рост гэтай катэгорыі адбываецца пераважна за кошт выцяснення "нацыянальнай" тэрміналогіі.

Самым папулярным сэнсавым азначэннем за ўвесь перыяд выступіла «паўстанне Кастуся Каліноўскага», якое мела моцныя пазіцыі і ў дзяржаўных, і ў незалежных медыя, але з 2023 года практычна знікае ў першых.

Азначэнні «нацыянальна-вызваленчае» ці проста «вызваленчае» пераважна цыркулявалі ў незалежных СМІ з эпізадычнымі згадкамі ў дзяржаўных, у той час як дэфініцыі «антыімперскае» і «антыцарскае» ўжываліся выключна ў незалежным сектары.

Намінацыя «польскае паўстанне» пашыраецца ў дзяржаўных СМІ як вынік барацьбы з нацыянальнымі наратывамі і элемент русіфікацыйнага дыскурсу. Яе ўдзельная вага значна выросла ў апошнія гады, прычым рост асабліва назіраецца падчас юбілейных дат і абвастрэння палітычных дыскусій. Тым не менш гэтая катэгорыя яшчэ не замацавалася ў якасці дамінантнай.

Інстытут палітычных даследаванняў «Палітычная сфера»
Памяць пра паўстанне
Наратывы 1863 года ў беларускіх грамадскіх дыскусіях, 2010–2024

www.palityka.org

ІНСТЫТУТ ПАЛІТЫЧНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ

ПАЛІТЫЧНАЯ СФЕРА